*Нататкі пісьменніка*

# Да Лынькова ў Крынкі

### Дарогай...

...Дарогай, а яна з Мінска да Крынак нямалая — туды шэсць гадзін ехалі — гаварылі, думалі аб месцы, статусе ці ролі — назвай як хочаш і не памылішся — пісьменніка ў жыцці народа. Нашага беларускага і пісьменніка, і народа. (Пісьменніка, маецца на ўвазе сапраўднага, а не нейкага калялітаратурнага прыстасаванца).

Так, калі творца з глыбінь народа і з'яўляецца праўдзівым выказнікам народных дум, яго шануюць. Такі пісьменнік для нашага народа, у якога маладая літаратура, вельмі нятростая гісторыя, мову якога, скажам прама, пастаянна прыніжаюць, а то і наогул ігнаруюць як такую, калі, здараецца, грэбуюць яго нацыянальнай годнасцю — на працягу стагоддзяў — і асветнік, і летапісец-гісторык, і настаўнік, і захавальнік нацыянальных традыцый, менталітэту і шмат чаго іншага. Вядома, у творах, найперш.

Хіба не такія Максім Багдановіч, Максім Гарэцкі, Кузьма Чорны, Аркадзь Куляшоў, Іван Мележ, Максім Танк, Уладзімір Караткевіч, Міхась Стральцоў ды і многія іншыя, знакамітыя і не зусім, але шчырыя рупліўцы на ніве роднага слова, роднай мовы, хто годна ўзняў над светам яе голас?..

Ці хіба не такія нашы сучаснікі: Васіль Быкаў, Янка Брыль, Іван Шамякін?.. Спіс можна доўжыць і доўжыць. Але з нагоды ў першы, вядома ж, спярша ўключым і Міхася Лынькова. Па якіх параметрах? Хаця б, думаю, па тым, што і яго многія творы непадуладны забыццю. Яны вытрымалі выпрабаванне часам, трывала ўвайшлі ў духоўнае жыццё папярэдніх пакаленняў і сёння займаюць адметнае месца ў навейшай культурнай гісторыі краіны.

Так, на многіх творах Міхася Лынькова выхоўвалася некалькі пакаленняў нашых людзей. Вазьміце, напрыклад, творы "Гой", "Андрэй Лятун", "Міколка-паравоз", "Векапомныя дні"... Я ўзяў за аднік толькі тры першыя названыя тут творы. Напісаны яны, як ведаем, у канцы 20-х — першай палове 30-х гадоў. Даўно сталі класікай. Зазначу: па іх яшчэ нашы дзяды і бацькі вучыліся. Жыццё спасціжаць. Мы — таксама. (Маю на ўвазе сваё пакаленне, якому зараз пяцьдзесят ці пад пяцьдзесят). Ды і пасля нас людзі вучыцца будуць.

Толькі вось што ўстрывожыла перад гэтай паездкай: а зараз як з Міхасём Ціханавічам Лыньковым? Адным з класікаў нашых... У часы, калі "у масы" здзекліва кінуты іншыя духоўныя "капітоўнасці". Калі сапраўдную літаратуру імкнуцца падмяніць "пісанінай", якая наогул не мае ніякіх адносін да мастацтва. Калі асобныя і свае, і чужыя вандалы духу грэбуюць мовай, а пісьменніка ў імкнуцца проціпаставіць народу, нярэдка — зняважыць іх. Калі, здараецца, нават і нашы некаторыя, як кажуць, "маладыя, ды ранніе", што і здольнасці неблагія маюць, зусім не бяздумна чамусьці (каму ва ўгоду?) заяўляюць — быццам не было ў нас раней літаратуры і зараз няма.

Кажуць, заводзяцы ў зман, быццам зараз такі час, што нікому няма справы да "вашай" літаратуры. Дык што ўжо казаць пра канкрэтных не носьбітаў!?

Ну што ж, гісторыя літаратуры наогул, і нашай ў прыватнасці, ведае выпадкі, калі рабіліся спробы прыніжаць як творчасць вялікіх мастакоў, так і іх чалавечыя асобы. Толькі дарэмна...

У такі час, з такім настроем ехалі мы — Навум Гальпяровіч, Васіль Праўдзіц, Таццяна Галіна і я (відаць, настрой такі быў больш у мяне, бо менавіта ў мяне перад гэтым адзін з "самаспечаных класікаў" з надуманым здзіўленнем спытаў: "А што, Лынькова яшчэ

Запрашэнне ж было з яго, Міхася Ціханавіча, радзімы. З Віцебшчыны. Але не з Зазыбаў, дзе нарадзіўся, — яны на тэрыторыі Віцебскага раёна (Акцябрскі сельсавет), а ў Крынкаўскай школы Лёзненскага раёна. Чаму менавіта адсюль — пра гэта пазней. Але ўсё адно: запрашэнне запрашэннем, можа, часам думалася, — на "мерапрыемства для галачкі"...

### Вядуць шляхі ўсе на радзіму...

Крынкі... Невялікая чыгуначная станцыя на Віцебшчыне. Племзавод. Вёска... Такіх паселішчаў на нашай роднай зямлі нямала.

Так, не тут сто гадоў таму нарадзіўся будучы класік беларускай літаратуры Міхась Лынькоў. Але ў Крынках, аказваецца, яго памятаюць, можа больш чым дзе. Тут сярэдняя школа носіць яго імя. Тут, каля школы, стаіць яму помнік, створаны народным мастаком Анатолем Анікейчыкам. Ды і працуючы, і юначуя гады будучага класіка беларускай нацыянальнай літаратуры прайшлі не на Віцебшчыне. Гэта таксама усім вядома. Але, як заўсёды бывае ў жыцці, ужо ў сталыя гады мноства самых розных жыццёвых дарог Міхася Лынькова аднойчы сышліся ў адну і прывялі яго на радзіму. Да вытокаў. Да гэтага часу грамадзянін і пісьменнік добра-такі спазнаў і сваю, і многія чужыя землі, імя яго было шырока вядома ў свеце, далёка за межамі нашай краіны.

Расказвае Лілія Іосіфаўна Алёшкіна, настаўніца-пенсіянерка, стваральніца і першы дырэктар Крынкаўскага школьнага музея М.Ц.Лынькова:

— Міхась Ціханавіч Лынькоў — наш зямляк. І калі я, маладая настаўніца роднай мовы і літаратуры, у канцы 50-х гадоў пачала працаваць у Крынках, ведаючы, што паблізу нарадзіўся такі знакаміты пісьменнік, неаднойчы думала, што нам трэба запрасіць яго да сябе. Мне хацелася, каб дзеці нашы хоць адзін раз убачылі жывога пісьменніка. Ды і сама я да гэтага часу таксама не сустракалася з пісьменнікам: гэта і падштурхнула мяне напісаць яму ліст і запрасіць у нашу школу.

...Стаяў прыгожы майскі ранак з водарам бэзу. Такім днём і прыязджае да нас Міхась Ціханавіч. Калі ён з'явіўся каля школьных веснічак, дзеці, настаўнікі літаральна засыпалі яго бэзам. Пахкім, з буйнымі кропелькамі расы. З вялікім ахапкам бэзу Міхась Ціханавіч і прыйшоў да нас у настаўніцкую. А настаўніцкая наша тады была маленькая. Тут празвінеў званок, мне трэба было ісці на ўрок у дзесяты клас. Не хацелася — так вабіла пачуць, што будзе гаварыць знакаміты пісьменнік. Але абавязак ёсць абавязак — пайшла. Ды кажу вучням: "Дзеці, давайце запросім на ўрок Міхася Ціханавіча". Пайшлі ў настаўніцкую адна вучаніца, вучань і я. А Лынькоў быў з крытыкам Дзмітрыем Бугаёвым. Запрасілі. Яны пераглянуліся... Міхась Ціханавіч пайшоў у клас.

Мне запомнілася яго постаць: высокі, хударлявы. І вочы, якія свяціліся дабрынёй. Вось гэтая дабрыня, свяцло яго душы перадаваліся праз вочы. Вучніў прысутнасць у класе такога знакамітага пісьменніка-земляка і ўсхвалявала, і запаланіла. Ён, зразумеўшы гэта, сказаў: "Дзеці, сёння ў нас будзе незвычайны ўрок", — і пачаў расказваць пра паездку ў Індыю.

Потым вучні пыталіся, над чым зараз працуе пісьменнік. Ён адказаў, што над кнігай "За акіянам", у якой расказа пра свой удзел у рабоце Генеральнай Асамблеі ААН, пра сустрэчы з кіраўнікамі розных краін, пра жыццё і побыт рабочых, сялян, інтэлігенцыі, пра прыгажосць прыроды, пра мудрасць і сардэчнасць простых людзей, з якімі давялося сустрэцца ў час падарожжа. Пра тое, што ў Індыі ён сустрэў многіх сяброў, якія ведаюць яго творы, з цікавасцю чытаюць іх